# Корань слова. Аднакаранёвыя словы

**А. М. Саўчанка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 17 г. Оршы,
кіраўнік раённага метадычнага аб'яднання настаўнікаў
беларускай мовы і літаратуры

Сярод сучасных школьнікаў сёння не знойдзецца тых, хто б не карыстаўся інтэрнэтам, не захапляўся відэагульнямі, не бавіў час за праглядам фільмаў і відэаролікаў. Аднак, на жаль, не кожны з іх умее адрозніць праўду ад падману, выбраць патрэбнае ў той інфармацыйнай прасторы, што з кожным годам становіцца ўсё шырэйшай. Менавіта дзеці, як не абароненыя ад шкоднага ўздзеяння медыя, становяцца ахвярамі маніпуляцый, трапляюць пад інтэрнэт-залежнасць. Таму сёння важна, каб вучань не толькі ўмеў "гугліць", але і ўмеў ацаніць атрыманую інфармацыю, умеў прыняць правільнае рашэнне. Гэта можна лічыць адной з актуальных адукацыйных задач, вырашыць якую дапаможа медыяадукацыя, якая і ўзнікла як шлях дапамогі вучням, якія жывуць у інфармацыйным грамадстве, залежаць ад тэхналогій, гэта выхаванне ў іх здольнасці глядзець на свет самастойна і прымаць свае ўласныя рашэнні [2].

Хоць у вучэбным плане ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі не прадугледжаны спецыяльны прадмет, які б здзяйсняў медыяадукацыю ў школе, але ў кожнага з нас ёсць магчымасць фарміраваць медыяпісьменнасць нашых вучняў падчас правядзення вучэбных заняткаў. Шырокія магчымасці ў вырашэнні гэтай праблемы маюць вучэбныя заняткі па беларускай мове і літаратуры. Прапанаваны ўрок беларускай мовы ў 6 класе дэманструе эфектыўнасць выкарыстання медыятэкстаў (рэкламных ролікаў) у адукацыйным працэсе.

ТЭМА: Корань слова. Аднакаранёвыя словы

МЭТА: стварэнне ўмоў для асэнсавання вучнямі сутнасці кораня як значымай часткі асновы слова і носьбіта яго асноўнага значэння, што захоўваецца ва ўсіх роднасных словах.

ЗАДАЧЫ:

- арганізаваць дзейнасць для ўдасканальвання ўменняў выдзяляць корань шляхам падбору аднакаранёвых слоў, аналізаваць аднакаранёвыя словы, вылучаць у іх агульную непадзельную частку, супастаўляць розныя па значэнні словы, карані якіх гучаць аднолькава, групаваць словы з улікам значэння кораня;
- садзейнічаць фарміраванню навыкаў знаходзіць аднакаранёвыя словы ў прапанаваных медыятэкстах і дарэчы ўжываць ва ўласным маўленні;
- стварыць умовы для фарміравання моўнай, камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай кампетэнцый, а таксама медыякампетэнцый, для развіцця ўменняў знаходзіць патрэбнае, аналізаваць, ацэньваць паведамленні ў розных відах медыя, жанрах і формах.

ТЫП УРОКА: урок вывучэння новага матэрыялу, інфармацыйна-камп'ютарнага навучання, з прыёмамі медыяадукацыі.

АБСТАЛЯВАННЕ: *Красней В.П., Лаўрэль Я.М., Несцяровіч В.І., Васюковіч Л.С.* Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / *В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль, В.І. Несцяровіч, Л.С.*

*Васюковіч.* Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2014; карткі з заданнямі, раздатачны матэрыял, камп'ютар, інтэрактыўныя дошка, медыяпаведамленні.

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

1. Арганізацыя класа.
2. Работа з відэаролікам сацыяльнай рэкламы беларускай мовы "Зараз ці ніколі".

- Ну, а мы ведаем беларускую мову, вывучаем яе, а на сённяшнім уроку зробім крок наперад у вывучэнні беларускай мовы.

- У медыятэксце (відэароліку) неаднаразова прагучалі словы *беларуска, беларуская (мова), па- беларуску.* Як называюцца такія словы?

Вучні на інтэрактыўнай дошцы вызначаюць агульную частку гэтых слоў.

3. Вызначэнне тэмы, пастаноўка мэт.

**ІІ. Аперацыянальна- пазнаваўчы этап.**

1. Самастойная работа з вучэбным дапаможнікам.

Карыстаючыся § 25 (с.105,107) вучэбнага дапаможніка, адказаць на пытанні:

-Якая частка слова называецца коранем?

-Якую функцыю выконвае корань?

-Як правільна вызначыць корань слова?

-З якімі словамі нельга блытаць роднасныя словы? Чаму?

-Што трэба памятаць, падбіраючы аднакаранёвыя словы?

2. Справаздача вучняў па выніках самастойнай работы.

3. Асэнсаванне выкананай работы.

а) абагульняльная гутарка па выніках самастойнай работы:

- Калі б вам давялося замяняць настаўніка ў пачатковых класах, якую б памятку вы парэкамендавалі вучням 2 ці 3 класа, каб тыя не памыліліся ў вызначэнні аднакаранёвых слоў?

4. Першаснае замацаванне.

а) прагляд відэаролікa камерцыйнай рэкламы "Квас "Хатні". Пад відэашэраг сялянскага жыцця гучыць тэкст:

*" – Эх, смаката!*

– *Смачненька!*

– *Як смачна!*

– *Можна по-рознаму апісаць смак квасу "Хатні". Але чым казаць, лепш пасмакаваць!*

*Квас "Хатні". Смачна піць!"*

б) аналіз медыяпаведамлення: знайсці аднакаранёвыя словы, вызначыць у іх корань.

На інтэрактыўнай дошцы вучні выпісваюць словы: *смаката, смачненька, смачна, смак, пасмакаваць, смачна.*

- Чаму ў адным выпадку ў аднакаранёвых словах корань -*смак*-, а ў другім – -*смач*-? Пра якую з'яву гэта гаворыць? Прывядзіце свае прыклады з чаргаваннем зычных і галосных у корані.

5. Фізкультхвілінка. У кожнага пад партай карткі з аднакаранёвымі словамі да слоў *сіні, трава, ноч, хмара, вечар* (выкарыстаны моўны матэрыял практыкавання 191 вучэбнага дапаможніка). Вучням неабходна ўстаць, нахіліцца, знайсці кожны сваё слова і размеркавацца па групах, знайшоўшы аднакласнікаў з аданакаранёвымі словамі:




*Вечаровы, хмарны, пераначаваць, утравець, падсініць, сінь, бясхмарны, вячэрні, сінеча, сінява, адвячорак, хмарыцца, вячэраць, вячэра, начаваць, начнік, траўка, сінець, начны, сінька, заначаваць, травяністы.*

6. Абагульняльная работа з медыятэкстам відэароліка камерцыйнай рэкламы “Час пачаставацца “Мівінай””:

а) аналіз моўных адзінак медыяпаведамлення:

- Ці можна словы *час* і *пачаставацца* назваць аднакаранёвымі? Чаму?






- А ці заўважылі вы ў відэаролiку арфаграфічную памылку? (калайдэр)

-А ці ведаеце вы што-небудзь пра адронны калайдар?

б) паведамленні вучняў пра адронны калайдар (суправаджаюцца слайд-шоу).






Вялікі адронны калайдар – самы вялікая ў свеце канструкцыя, якая паскарае часціцы. Ідэя стварэння калайдара ўзнікла яшчэ ў 1984 годзе, праект на будаўніцтва быў адобраны ў 1995 годзе, а запушчана была толькі ў 2008. У будаўніцтве і даследаваннях удзельнічаюць 10 тысяч вучоных і інжынераў больш чым са 100 краін.

А чаму ж ён адронны? Адроны – клас элементарных часціц, якія моцна ўзаемадзейнічаюць. Адроны складаюцца з кваркаў. Адроны дзеляцца на барыёны і мезоны. З барыёнаў складаецца амаль усе вядомыя нам рэчывы. Барыёны – гэта нуклоны (пратоны і нейтроны, якія складаюць атамнае ядро).

Маштаб калайдара ўражвае. У яго складзе 4 гіганцкія дэтэктары. Адронны калайдар уяўляе сабой кальцавы тунэль, які ляжыць пад зямлёй на глыбіні ад 50 да 175 метраў. Даўжыня калайдара 26 659 метраў. Пратоны, якія разагналі да хуткасці, блізкай да хуткасці святла, пралятаюць у падземным крузе па тэрыторыі Францыі і Швейцарыі. Для факусіроўкі выкарыстоўваюцца звышмоцныя магніты, іх агульная даўжыня каля 22 кіламетраў, а працуюць яны пры тэмпературы -271 градусаў па Цэльсіі.

**III. Кантрольна – карэкцыйны этап.**

1. Выніковы тэст.

1. Адзначце правільныя сцверджанні:

1) корань – гэта зменная значымая частка слова, якая служыць для ўтварэння форм слова, для сувязі слоў у словазлучэннях і сказах;

2) корань – гэта частка слова без канчатка, у якой заключаецца канкрэтнае лексічнае значэнне;

3) корань – гэта галоўная значымая частка аднакаранёвых слоў, у якім заключаецца агульнае лексічнае значэнне роднасных слоў;

4) каб правільна вызначыць корань, трэба падабраць як можна больш роднасных слоў;

5) сінонімы можна аднесці да аднакаранёвых слоў.

2. Адзначце памылкова напісаныя словы:

1) прынтэр;

2) калайдар;

3) шніцаль;
4) камп’ютар;
5) майстэр.
3. Адзначце аднакаранёвыя словы да слова род-:
1) родны;
2) радня;
3) сваяк;
4) радок;
5) Радзіма.
4. Адзначце рады слоў, у якіх сустракаюцца толькі аднакаранёвыя словы:
1) чорны, чорнавалосы, чарнявы;
2) змена, змяненне, змяніць;
3) смак, смаката, пасмакаваць;
4) час, пачаставацца, частковы;
5) раней, спрадвечна, спрадвеку.
5. Адзначце рады, у якіх словы нельга аднесці да аднакаранёвых:
1) спыніць, прыпыніць, суняць;
2) племя, пляменнік, племянны;
3) гора, гараваць, горкі;
4) шэрсць, шарсцяны, шэрсцеапрацоўчы;
5) лес, лесвіца, леска.
2. Самаправерка па эталоне. Адказы:

1 – 3 4
2 – 1 5
3 – 1 2 5
4 – 1 2 3
5 – 1 3 5

**IV. Дамашняе заданне:**

§ 25, практыкаванне 195

**V. Рэфлексія.**

- Тэст паказаў, што корань слова і аднакаранёвыя словы вамі засвоены, а якія яшчэ пазапрадметныя веды вы атрымалі?

- Ахарактарызуйце сваю работу на вучэбным занятку, выкарыстоўваючы аднакаранёвыя словы.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Медыяадукацыя ў сучаснай школе:** зборнік навукова-метадычных артыкулаў /
Т. Ваврава [і інш.]; пад рэд. М. І. Запрудскага. – Мінск, 2016. – 91 с.

2. **Медыяадукацыя ў школе:** фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапаможнік для настаўнікаў / М. І. Запрудскі [і інш.]; пад рэд. М.І. Запрудскага. – Мінск, 2016. – С. 11–12.

3. **Челышева, И. В.** Методика и технология медиаобразования в школе и вузе / И. В. Челышева. – Таганрог: Таганрог. гос. пед. ин-т, 2009. – 320 с.